КРАЯЗНАЎЧАЕ ТАВАРЫСТВА "МАЛОЕ ПАЛЕССЕ"

# ГІСТОРЫЯ

## *Друцка-Бярэзінскага краю*

Матэрыялы Першых грамадскіх
навукова-краязнаўчых чытанняў

*Мінск-Крупкі-Магілеў*
*28 сакавіка, 17 траўня, 20 чэрвеня 2015 г.*

Мінск-Крупкі

2015

УДК 94(476)(06)+908(476)(06)

ББК 63.3(4Беи)

И 90

Укладальнік:

*А.П. Аляхновіч*

Рэдакцыйная калегія:

*В.І. Шадыра,* старшы навуковы супрацоўнік
ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт (навуковы рэдактар),

*В.В. Урублеўскі,* галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў
ДУ “Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ)”,
кандыдат гістарычных навук (Мінск),

*Ю.М. Снапкоўскі,* галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў
ДУ “Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ)”,

*А.П. Аляхновіч,* даследчык гісторыі, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Гісторыя Друцка-Бярэзінскага краю**, матэрыялы Першых грамадскіх навукова-краязнаўчых чытанняў, Мінск-Крупкі-Магілеў, 28 сакавіка - 20 чэрвеня 2015 г./ укладальнік: А.П. Аляхновіч. – Мінск, 2015. – 310 с.

ISBN

Зборнік змяшчае матэрыялы Першых грамадскіх навукова-краязнаўчых чытанняў “Гісторыя Друцка-Бярэзінскага краю”, якія праходзілі ў Мінску, Крупках і Магілеве 28 сакавіка, 17 траўня і 20 чэрвеня 2015 г. Публікуюцца даклады навукоўцаў і краязнаўцаў, прысвечаныя розным старонкам гісторыі і культуры рэгіёна Малога Палесся (Друцка-Бярэзінскага краю). Матэрыялы зборніка будуць карыснымі даследчыкам, настаўнікам і ўсім зацікаўленым роднай гісторыяй.

УДК 94(476)(06)+908(476)(06)
ББК 63.3(4Беи)

ISBN

© Краязнаўчае таварыства “Малое Палессе”, 2015

**Сяргей Рындзін, (Мінск)**

## ДЭПАРТАЦЫЯ ЗАМЕЖНЫХ ПАДДАНЫХ З БАРЫСАЎСКАГА ПАВЕТА У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Пачатак Першай сусветнай вайны адзначаўся істотнымі зменамі ў жыцці беларускіх губерняў: маштабная мабілізацыя, засяроджванне на тэрыторыі Беларусі буйных воінскіх злучэнняў, перавод мясцовай эканомікі на абслугоўванне патрэб фронту, узмацненне паліцэйскага нагляду за грамадзянскім насельніцтвам. Апошняе было неабходна уладам для прадухілення масавых беспарадкаў, дыверсійнай дзейнасці і кантрабанды ў найбліжэйшым тыле дзеючай арміі. Абвінавачаных ці хаця б западозраных у «нядобранадзейнай дзейнасці» прадпісвалася падвяргаць турэмнаму зняволенню і прымусоваму высяленню на ўсход Расійскай імперыі.

Як сведчаць архіўныя дакументы, да найбольш распаўсюджаных відаў парушэнняў грамадскага парадку ў перыяд Першай сусветнай вайны адносіліся чуткі, публічныя крытычныя выказванні ў адрас ўрада, незаконны продаж спіртных напояў, перапіска на мовах краін-праціўнікаў, спекуляцыя на рынку тавараў першай неабходнасці.

Аднак за асобнай групай мірных жыхароў аўтаматычна замацоўваўся статус «нядобранадзейных элементаў», незалежна ад іх законапаслухмянасці. Гэта былі падданыя ваюючых з Расіяй дзяржаў. З пачатку вайны з Германіяй і яе саюзнікамі расійскія ўлады разгарнулі ўнутры імперыі кампанію супраць так званых «варожых» падданых, якая хутка распаўсюдзілася на ўсіх асоб нямецкай, венгерскай, турэцкай і балгарскай нацыянальнасцяў. Кампанія мела істотны ўплыў на жыццё дзяржавы. Закліканая забяспечыць бяспеку ад «ўнутраных ворагаў», яна фактычна падрывала краіну знутры. Ліквідацыя гаспадарак каланістаў, прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў, якія належалі «ворагам», наносіла шкоду эканоміцы; германафобія, барацьба са «шпіёнствам» правакавалі сацыяльную напружанасць, этнічную нецярпімасць. У Расійскай Федэрацыі быў абаронены шэраг дысертацый па гэтай праблеме. Але ў гэтых працах беларускія губерні амаль не разглядаюцца. Не праводзіліся комплексныя даследаванні і беларускімі гісторыкамі.

Падданыя Германіі і яе саюзнікаў разглядаліся расійскімі ўладамі як патэнцыйныя шпіёны і рэзерв для армій праціўніка. Па гэтай прычыне выезд з Расіі падданых Германіі і Аўстра-Венгрыі прызыўнога ўзросту (ад 18 да 45 гадоў) быў строга забаронены. З прыфрантавых заходніх губерняў у цэнтральныя і ўсходнія «варожыя» замежнікі высяляліся ўладамі. Пер-

шачарговаму высяленню падлягалі ваеннаабавязаныя германцы і аўстрыйцы, каб прадухіліць іх ўступленне ў шэрагі германскай і аўстра-венгерскай армій у выпадку акупацыі праціўнікам прыгранічных губерняў. Таксама, з пункту гледжання ўладаў Расійскай імперыі, гэта была мера па ачышчэнню тылу дзеючай арміі ад найбольш верагодных шпіёнаў, дыверсантаў і правакатараў. Пазней аналагічныя мерапрыемствы праводзіліся і ў дачыненні да падданых Турцыі і Балгарыі.

Замежныя падданыя складалі нязначную долю насельніцтва беларускіх губерняў. Вынікі усерасійскага перапісу 1897 г. паказалі, што ў межах Мінскай, Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў пастаянна пражывала 12 973 замежніка (0,15% ад агульнай колькасці пастаянных жыхароў дадзеных губерняў). Характэрна, што большасць складалася з падданых сумежных з Расіяй дзяржаў – Германіі (9 704 чал.) і Аўстра-Венгрыі (2 896 чал.), якія як раз і сталі праціўнікамі Расіі ў Першай сусветнай вайне [5, с. 13]. Аналагічная сітуацыя была характэрна у прыватнасці і для Барысаўскага павета. У 1902 г. на яго тэрыторыі пражывалі 27 замежных падданых (у суадносным спісе, складзеным 18 снежня 1902 г. барысаўскім павятовым спраўнікам адзначаліся толькі дарослыя мужчыны, без уліку жонак і дзяцей). 11 з іх з'яўляліся падданымі Германіі, 9 – Аўстра-Венгрыі, 5 – Турцыі і 2 – Швейцарыі. Па роду заняткаў сярод іх пераважалі прамысловыя рабочыя і зямельныя арандатары. Нерухомай маёмасцю ніхто не валодаў [1, л. 16–24].

Пасля абвяшчэння вайны замежнікі-мужчыны прызыўнога ўзросту афіцыйна станавіліся ваеннапалоннымі. Тыповым прыкладам з'яўляецца справа жыхара Барысаўскага павета, аўстрыйскага падданага Яўгена Грыневіча. 28 ліпеня 1914 г. (па старым стылі) ён па пастанове барысаўскага павятовага спраўніка быў затрыманы і змешчаны ў барысаўскую турму як ваеннапалонны. У сваім прашэнні на імя мінскага губернатара А.Ф. Гірса ён паведамляў, што на працягу 9 гадоў пражываў у Расіі, ўзбуджаў хадайніцтва аб прыняцці ў расійскае падданства, ад службы ва ўзброеных сілах Аўстра-Венгрыі быў вызвалены яшчэ ў 1900 г. Пра сябе ён таксама напісаў: «За час майго пражывання ў Расіі не цікавіўся ніякай палітыкай, вёў жыццё нароўні з усімі вернападданымі і ў дачыненні да шпіёнства не магу выклікаць ні найменшага падазрэння, аб чым можа засведчыць мясцовая Барысаўская паліцыя» [2, л. 27–27 аб]. Грыневіч, нягледзячы на названыя ім абставіны, рашэннем Барысаўскага павятовага паліцэйскага упраўлення ад 9 жніўня 1914 года падлягаў высылцы ў г. Арэнбург. Але ў сваім наступным прашэнні ад 27 жніўня 1914 г. ён пісаў, што з-за часовага прыпынку этапных партый ужо 2 тыдні знаходзіцца ў турэмным зняволенні [2, лл. 32–33].

У верасні 1914 г. барысаўскі павятовы спраўнік у сваім рапарце інфармаваў мінскага губернатара, што акрамя Грыневіча ў якасці ваеннапалонных былі затрыманы і змешчаны ў барысаўскую турму яшчэ 6 чалавек: германскія падданыя Франц Францаў Ульрых, Герман Аўгустаў Кліммер, Іван Тыль, Освін Эдвін Нейберт, Адольф Аўгустаў Зевеліс і аўстрыйскі падданы Аляксандр Фішэр [2, л. 34]. Арыштаваных выслалі 16 верасеня 1914 г. этапным парадкам у г. Кацельніч Вяцкай губерні [2, л. 41].

У тым жа месяцы ў Ніжні Ноўгарад былі адпраўлены аўстрыйскія падданыя Павел Розенкранц, Самуіл Кневель і германскі падданы Станіслаў Цезарко [2, л. 53].

Месцамі спасылкі для замежнікаў з Барысаўскага павета сталі таксама мястэчка Багуслаўка Луцкага павета Валынскай губерні, вёска Каркава Царовакакшайскага павета Казанскай губерні, гарады Смаленск, Арэнбург, Арол, Уладзімір, Мажайск,

Калуга, Самара, Чырвоны Яр (у Астраханскай губерні). Усяго, згодна выяўленым дакументам, са жніўня 1914 г. па жнівень 1915 г. па патрабаванню ўладаў Барысаўскі павет пакінулі 22 германскіх і 12 аўстрыйскіх падданых. Сярод іх былі і шэсць жанчын - германкі Канстанцыя Герц, Ядвіга Ульрых, Сафія Сладоўская, якія выбылі на жыхарства ў Багуслаўку, Індыцкая (імя і імя па бацьку невядомыя), Наталля Шэтт і Еўфрасіння Бараноўская. Прычым зяць замежнай падданай Індыцкай земскі урач Навагрудскага павета М.К. Шыманоўскі апісаў сваю цешчу як «бездапаможную і хворую». Наталля Шэтт вырашыла ігнараваць пастанову уладаў і падвергнулася за гэта месячнаму арышту [2, лл. 56, 141-142, 148, 192].

Вяртанне высланых замежнікаў на ранейшыя месцы жыхарства да заканчэння ваенных дзеянняў прызнавалася ўладамі немагчымым. Таму адпаведныя хадайніцтвы пакідаліся без задавальнення. 30 верасеня 1914 г. дваранін Іван Лянкевіч, уладальнік маёнтка Бярозаўка Барысаўскага павета, звярнуўся з прашэннем да мінскага губернатара аб вяртанні з Арэнбурга германскіх падданых Адольфа Лянгэ, яго сына Івана і аўстрыйца Аляксандра Вілімэка. Усе трое былі рабочымі ў маёнтку Лянкевіча. Просьбіт засяродзіў таксама увагу і на тое, што яго былыя працаўнікі не ведаюць нямецкай мовы, усё жыццё жывуць у Расіі, а на новым месцы жыхарства знаходзяцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Маёнтак прыходзіў ў заняпад, так як яго пакінулі яшчэ 18 рабочых – расійскіх падданых, прызваных па мабілізацыі ў дзеючую армію. Нягледзячы на поўнаю заруку з боку Лянкевіча, яго хадайніцтва было пакінута мінскім губернатарам без наступстваў [2, лл. 60–61]. Але, як відаць па архіўных крыніцах, ваенныя ўлады маглі зрабіць выключэнне для тых «варожых» замежнікаў, якія з'яўляліся каштоўнымі работнікамі на мясцовых прадпрыемствах па выпуску ваеннай прадукцыі. Напрыклад, 25 жніўня 1915 года галоўны начальнік Мінскай ваеннай акругі Я.А. Рауш фон Траўбенберг даў дазвол на пражыванне ў Нова-Барысаве 43-гадовага германскага падданага А. Эрбрыха, які служыў інжынерам-механікам на Прушкаўскім заводзе па вырабу ручных гранат. Першапачаткова завод знаходзіўся ў Варшаве, але летам 1915 быў эвакуіраваны разам з персаналам ў Барысаў [2, л. 125-125 аб, 131].

Фармальна ад абавязковай дэпартацыі вызваляліся фізічна непрыдатныя да ваеннай службы, а таксама жанчыны, старыя і дзеці. Але пры гэтым яны знаходзіліся пад пастаянным наглядам паліцыі. 19 верасня 1914 г. мінскі губернатар дазволіў ўезд у Нова-Барысаў германскай падданай Ізабэле Пятроўне фон-Матчынскай разам з дачкой Чэславай [2, л. 48]. 68-гадовая фон-Матчынская і двое яе дзяцей былі высланы з Мінска ў г. Вятку. Там яна накіравала Вяцкаму губернатару І.М. Страхоўскаму прашэнне, у якім пісала: "Я вельмі слабая і ўвесь час хварэла. Не атрымаўшы яшчэ ні грошай сваіх з банка і ні багажу мы засталіся без цёплай вопраткі і не прывыклі да тутэйшага суровага клімата». У выніку быў атрыманы дазвол на пераезд да знаёмай Марыі Тыль ў Нова-Барысаве [1, л. 45]. Аднак сын Вітальд як ваеннапалонны заставаўся ў Вятцы. Выпадак фон-Матчынскай з'яўляецца яшчэ адным пацвярджэннем таго факту, што дэпартацыі маглі быць падвергнуты ўсе «варожыя» замежнікі незалежна ад полу, ўзросту і стану здароўя.

Прымусовы выезд замежнікаў мужчын ва ўсходнія губерні часта станавіўся трагедыяй для іх сем'яў, якія заставаліся без карміцеляў. У адрозненне ад сем'яў прызыўнікоў матэрыяльная дапамога сем'ям «ворагаў» законам не прадугледжвалася. Сваякі дэ-

партаваных у сваіх прашэннях спрабавалі звярнуць на гэта ўвагу ўладаў. Характэрным з'яўляецца пісьмовы зварот да мінскага губернатара 75-гадовага германскага падданага Фрыдрыха Тэфке, які пражываў у мястэчку Смалявічы Барысаўскага павета. З-за свайго ўзросту ён сам не з'яўляўся ваеннаабавязаным і таму не падлягаў арышту і высяленню. Арыштаваны і затым выправаджаны ў Калугу быў яго 49-гадовы сын Карл. Яго бацька з гэтай нагоды сцвярджаў: «Знаходжуся без усялякіх сродкаў да жыцця, так як цалкам мы знаходзіліся на ўтрыманні названага і высланага нашага сына. Вельмі бядотнае маё старога з жонкаю старой становішча змушае мяне слёзна маліць Ваша Правасхадзіцельства зрабіць распараджэнне аб вяртанні сына майго Карла на ранейшае жыхарства ў мястэчка Смалявічы і гэтым зробіце нам старым найвялікшую ласку, за якую будзем вечна дзякаваць». Хадайніцтва Тэфке было адхілена [1, лл. 73-74]. Аналагічны адказ атрымлівалі і іншыя просьбіты.

У цэлым, аперацыя па ачышчэнню заходніх губерняў ад «варожых» замежнікаў працягвалася да кастрычніка-снежня 1915 г. [4, с. 158] У першую чаргу было заяўлена аб дэпартацыі ваеннаабавязаных мужчын. Але на практыцы мелі месца выпадкі высялення незалежна ад узросту і фізічнага стану. Як паказалі архіўныя дакументы, дыскрымінацыі падвяргаліся і тыя замежнікі, якія дзесяцігоддзямі жылі ў Расіі, уступалі ў шлюб з расійскімі падданымі, не мелі сувязяў з замежжам.

Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны дэпартаваныя падданыя Германіі і Аўстра-Венгрыі, а таксама расійскія падданыя нямецкага паходжання (нямецкія каланісты), якія падвергліся дэпартацыі ў 1915 г., атрымалі магчымасць вярнуцца на ранейшыя месцы жыхарства. Але ў 1930-я гг. з-за абвастрэння адносін з нацыскай Германіяй немцы, якія жылі ў прыгранічных заходніх рэспубліках СССР сталі зноў высяляцца, прычым без права на вяртанне. Толькі у 1970-я гг. яны пачалі вяртацца ў БССР [3].

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 295. – Оп. 1. – Д. 7282. Списки иностранных подданных проживающих по Минской губернии (1902–1903 гг.). – 128 арк.
2. НГАБ. – Ф. 295. – Оп. 1. – Д. 8629. Дело о высылке германских и австрийских подданных из Борисовского уезда Минской губернии. – 200 арк.
3. Новикова, Л. О немецкой диаспоре в Беларуси / Л. Новикова // Новости и аналитика о Германии, России, Европе, мире [Электронный ресурс]. – 2006. – Режим доступа: dw.de›о-немецкой-диаспоре-в-беларуси/a-2037464-1. – Дата доступа : 02.03.2015.
4. Рындин, С.Н. Мероприятия гражданских властей белорусских губерний по выселению иностранных подданных в 1914–1915 гг. / С.Н. Рындин // Архіварыус: Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў. Вып. 11 / рэд.: Ю.М. Бохан [і інш.]. – Мінск: БелНДІДАС, 2013. – С. 150–159.
5. Рындин, С.Н. Политика российского правительства в отношении иностранных подданных на территории Беларуси накануне и в годы Первой мировой войны / С.Н. Рындин // Веснік Бел. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. – 2013. – № 1. – С. 13–16.